# «У пошуках страчанага»

**Выстава "Тайны канцылярыі", якая адкрылася 24 верасня ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у нейкім сэнсе атрымалася не падобная да іншых. Бо, здаецца, упершыню ў нашай краіне была здзейснена спроба шырока прадставіць вядомую і зусім невядомую гісторыю пісьменства праз дэманстрацыю рарытэтных пісьмовых прыладаў.**





На выставе можна пабачыць, чым пісалі нашы продкі ў XV—XX стст.; першыя алоўкі і асадкі, пер'ечысткі, пясочніцы, чарніліцы і інш.; пісьмовыя прылады знакамітых людзей (і, нават, якой магла быць ручка Скарыны!). Тут таксама можна даведацца, які хадавы тавар айчынных і замежных вытворцаў быў у продажы ў канцылярскіх і папяровых крамах Мінска і Гродна ў старыя часы. І нават як і што рэкламавалі на канцылярскіх прадметах пачатку XX ст., якія адмысловыя пісьмовыя прылады рыхтавалі ў валізку падарожнікі.

Школьная тэма экспазіцыі адкрывае змесціва ранца гімназістаў розных эпох (сшыткі, алоўкі, асадкі, тачылкі, закладкі, пеналы...), а таксама дэманструе, як выглядала парта ліцэіста А. Пушкіна.

Выстава прадстаўляе ўвазе наведвальніка пісьмовыя прылады вядомых асоб і іх сям'яў — князёў Радзівілаў, родных кампазітара С. Манюшкі, краязнаўцы і гісторыка О. Гедэмана, фінансіста Л. Палякова, нямецкага фатографа Ф. Краўскопфа, маршала С. Цімашэнкі і іншых.

Для сапраўдных "гурманаў канцылярыі" прадстаўлены пісьмовыя наборы, чарніліцы ў розных мастацкіх стылях, а таксама ўзоры пісьмовых прылад высокамастацкай работы з каштоўных матэрыялаў.

Трэба адзначыць, экспазіцыя падрыхтавана ў межах аўтарскага праекта лаўрэата прэміі "За духоўнае адраджэнне" У. Ліхадзедава "У пошуках страчанага" і дазваляе праз прадметы калекцыі даследчыка адкрыць цэлы мацярык, забыты пласт матэрыяльнай культуры, звязаны з традыцыяй пісьменства.

**Выстава "Тайны канцылярыі" будзе працаваць з 24 верасня 2020 г. да 15 лістапада 2020 г. штодзень, акрамя панядзелка і дзяржаўных свят. Уваход — па чытацкаму білету ці квітку сацыякультурнага цэнтра.**

**Паводле інфармацыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і сацыяльных сетак**

## ТЭАТРЫ

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ**
**ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ**
*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1*
■ **27 — "Спартак"** А.Хачатур
Дырыжор — Мікалай Калядка
■ **27 — Канцэрт "Вяртанне**
■ **28 — "Паяцы"** Р.Леанкавал
Дырыжор — Уладзімір Авадо
■ **29 — "Бахчысарайскі фан**
Дырыжор — Мікалай Калядка
■ **30 — "Мадам Батэрфляй"**
Дырыжор — Андрэй Галанаў.
■ **30 — "Viva la Mamma"** Г.Да

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭС**
**"РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛ**
*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./*
■ **28 — "Сірожа"** (жыццё ў 2-х
■ **29 — "Шлюб з ветрам"** (пес
Яўген Карняг.

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛ**
*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8*
■ **26 — "Сонейка і снежныя**
дзею). А.Весялова. Пачатак аб
■ **27 — "Бука"** (казка-гульня
Пачатак аб 11-й.
■ **30 — "Сунічкі для Веліканa**
(кранальная гісторыя на 1 дзею